УДК 008(476) “18/19”

Н.М. Якуш канд. гіст. навук, дац. (БДТУ, г. Мінск)

# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ДУМКА ПЕРЫЯДУ XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ.

У сістэме еўрапейскага культуразнаўства беларуская культуралогія не прадстаўлена ўзроўнем “вучэння”, гэта значыць не мае завершаных твораў, якія будуюцца на пэўнай філасофскай альбо рэлігійнай аснове. Але развіццё любой культуры адначасова з’яўляецца і працэсам самаўсведамлення, самаспасціжэння ўласнай існасці. У гэтым сэнсе беларуская культура назапасіла багатую традыцыю і значны вопыт пазнання і самаасэнсавання.

З нагоды складаных сацыяльна-палітычных умоў этнічнага развіцця накірункі беларускага культуразнаўства вызначаліся праблемай культурнай самабытнасці і нацыянальнай самастойнасці беларусаў, дыскусіяй наконт канфесійных фактараў самаідэнтыфікацыі народа. Акрэсленая тэматыка заўсёды разглядалася ў агульным кантэксце пошуку гуманістычных духоўных ідэалаў. У падмурак галіны ведаў аб культуры ляглі тэарэтычныя развaжанні Ф. Скарыны пра універсальныя маральна-этычныя каштоўнасці. Пазней рэлігійныя мысліўцы розных хрысціянскіх канфесій прадоўжылі такую традыцыю. Яны ўзнялі праблему праявы “боскай гармоніі ў чалавеку”, распрацоўвалі канцэпцыю “Дабра і Зла”, ідэю “паўнаты” чалавечага жыцця і “свабоды волі”. На гэтай аснове фарміруецца ідэал чалавека надзеленага вялікай дабрачыннай сілай, неабходнай для пераўтварэння “фізічнага” чалавека ў чалавека культурнага.

У XIX стагоддзі істотна мяняецца сацыяльна-культурная прастора Беларусі. Развіццё вытворчых капіталістычных адносін абумовіла пачатак кансалідацыі этнаса ў агульнаграмадзянскую нацыю. Культурнае самаспасціжэнне беларусаў уздымаецца на якасна новы узровень і пачынаецца станаўленне ўласна навукі аб беларускай культуры. Да XX стагоддзя гэты даволі бурны працэс прайшоў пэўныя этапы сталення, ускладнення і афармлення.

У першай палове стагоддзя пачынаюцца першыя даследаванні беларускай культурнай традыцыі і пластоў архаікі. Карані беларускага культуразнаўства афармляліся разам з ажыўленнем і адраджэннем беларускамоўнай літаратуры. Прадстаўнікі так званай беларускай школы ў польскай літаратуры – Я. Баршчэўскі, Я.Чачот, В. Равінскі, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Вярыга-Дарэўскі ў рэчышчы патрабаванняў эстэтыкі рамантызму звярнуліся да фальклору, народнай паэзіі свайго краю і ўключылі іх у сваю творчасць. Па меркаванню першага

гісторыка беларускай літаратуры Р. Падбярэскага, у зборніку Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» ужо быў дакладна акрэслены міфалагічны архетып беларуса, а ўся кніга ўнутрана скіравана на універсальна-цэласнае асэнсаванне ключавых, духоўных асноў народнага жыцця [1, с.21 ].

Разуменне, што асноваю ў духоўным развіцці чалавека з’яўляецца далучэнне да вуснапаэтычнай творчасці лягло і ў падмурак светаадчування першых даследчыкаў краю. Гэта зрабіла вывучэнне культуры самастойнай зонай даследчыцкіх інтарэсаў, а працэс культурнага самапазнання набыў устойлівасць. Этнографы, краязнаўцы, фальклярысты раскрылі глыбіню народнай філасофіі, апісалі духоўны скарб гістарычнай памяці. Культуразнаўства гэтага часу характарызавалі міфалагізацыя і ідэалізацыя патрыярхальнай даўніны, дамінаванне краязнаўчай тэматыкі, перавага апісальнасці над аналізам. Тым не менш, развіццё ведаў пра беларускую культуруў першай палове XIX стагоддзя засведчыла станаўленне гісторыка-культуралагічнай думкі. Значны ўклад у яе фарміраванне ўнеслі даследчыкі Беларусі І. Грыгаровіч, І. Даніловіч, Т. Нарбут, І. Насовіч, С. Мікуцкі, А. Кіркор, браты Я. і К. Тышкевічы. Менавіта гэтая форма культуралагічнай думкі моцна паўплывала на станаўленне нацыянальнага менталітэту, новай літаратурнай нормы і эстэтыкі, стала чыннікам новага этапу этнічнай свядомасці і самаідэнтыфікацыі.

У другой палове XIX стагоддзя беларускае культуразнаўства набывае трывалы навуковы падмурак. Сіламі мясцовых, а таксама рускіх і польскіх даследчыкаў значна пашыраецца вывучэнне беларускай мінуўшчыны, з’яўляецца шэраг глыбокіх даследаванняў і цікавых прац па гісторыі і этнаграфіі. Набыткамі беларускай культуралогіі сталі працы М. Доўнар-Запольскага, М. Нікіфароўскага, А. Семянтоўскага, А. Сапунова. Але найбольш значную ролю адыграў Я. Карскі – аўтар больш 700 прац па славістыцы, беларусістыцы і русістыцы. Кіруючыся прынцыпамі культурна-гістарычнай школы, Карскі правёў комплекснае даследаванне шматвяковай культуры беларускага народа і абгрунтаваў яго нацыянальную самабытнасць. Даследчык вызначыў час фарміравання беларускай народнасці, распрацаваў вучэнне пра гукавы і граматычны лад старабеларускай і сучаснай беларускай мовы, ахарактарызаваў асноўныя жанры і віды народнай паэзіі, даследаваў побытовую культуру, светапогляд, рэлігійна-міфалагічны светапогляд плямён, якія склалі аснову беларускай народнасці[ 2, с. 70-115 ].

Ва ўмовах адсутнасці самастойных форм палітычнага і эканамічнага жыцця, культура прыняла на сябе гістарычныя функцыі кансалідацыі нацыі і фарміравання пачуцця нацыянальнага

патрыятызму, што надавала культуралагічнай думцы Беларусі сацыяльна-палітычную завостранасць. Гэтыя рысы яскрава ўвасобіліся ў тэарэтычнай, мастацкай і грамадскай дзейнасці вялікай плеяды таленавітых пісьменнікаў.

Глыбінныя зрухі ў беларускай культуралагічнай думцы звязаны з імем М. Гарэцкага. Гэты класік беларускай літаратуры, празаік, крытык, літратуразнавец, фалкларыст, лексікограф ужо ў ранніх творах вылучае наступную праблематыку: духоўнае сталенне нацыі, актывізацыя глыбінных гісторыка-культурных патэнцый беларусаў, пераадоленне комплексу нацыянальнай прыніжанасці. М. Гарэцкі абгрунтаваў таксама грамадскае прызначэнне беларускай літаратуры, культуры, інтэлігенцыі, сфармуляваў звышзадачу культурнага адраджэння - « падняць беларуса да ідэальнага чалавека », «аднавіць арганізм Беларусі і зрабіць яго дужэйшым»[3, 74-81 ].

Найбольшую грамадзянскую сілу, выяўленча-эстэтычную моц і непасрэдна класічную сутнасць культуралогіі выявіла творчасць такіх пісьменнікаў і мысліўцаў як Ф. Багушэвіч, Я. Колас, Я. Купала.

Ф. Багушэвіч як адзін з пачынальнікаў крытычнага рэалізму таленавіта спалучае ў сваіх творах гісторыка-філасофскае і мастацкае асэнсаванне лёсу беларускага народа, заклікае да нацыянальнага абуджэння, прадстаўляе своеасаблівую канцэпцыю развіцця беларускай мовы, дае этнаграфічную даведку аб межах яе распаўсюджвання. Спадчына пісьменніка стала фундаментам ідэалогіі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў пачатку XX стагоддзя.

Колас і Купала выступілі ў якасці самабытных народных філосафаў. Спадчына Коласа ўвасобіла ідэйна-эстэтычную дамінанту беларускай культуралогіі з яе імкненнем да гармоніі са светам. Ён стварае нацыянальны эталонны беларускі пейзаж, краявід, як істотную частку нацыянальнага космасу, праз якія яго героі адчуваюць сябе часцінкай Сусвету. Роль мастака-творцы на прыкладзе Сымона-музыкі Колас вызначае як сувязнога паміж прыродай, народам і сакральным светам, які сілай свайго таленту далучаецца да сусветнай гармоніі.

Я. Купала стаў душою беларускай нацыі і прарокам нацыянальнага адраджэння. Ідэалы свабоды і сацыяльнай справядлівасці былі вызначальнай ідэяй усёй творчасці паэта. Нацыянальна-патрыятычныя матывы ўвасобіліся ў творах асветніцкага беларусазнаўчага характару, у якіх творца мэтанакіравана тлумачыў мужыку, што ён менавіта беларус. У зборніку «Шляхам жыцця» найбольш ярка выяўлена імкненне паэта да абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, фарміравання пачуцця гордасці і ўдзячнасці да продкаў, якія былі

здольны захоўваць сваю дзяржаўнасць і незалежнасць. У творах рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку Купала стварае паэтычны вобраз Маладой Беларусі, абуджанай да гістарычнай самасвядомасці. Яго творчасць дарэвалюцыйнага часу – цэлая і цэласная сістэма нацыянальна-патрыятычнага выхавання. Такім чынам, беларуская культуралагічная думка афармляецца ў літаратурна-мастацкай творчасці і публіыстычнай дзейнасці беларускай інтэлігенцыі, становіцца тэарэтычным абгрунтаваннем наыянальнай ідэі.

Пачатак уласна філасофскаму асэнсаванню беларускай культуры быў пакладзены філасофскімі эсэ “Адвечным шляхам” Абдзіраловіча (Канчэўскага) і “Гэтым пераможам” Сулімы”. У аснову сваёй канцэпцыі Канчэўскі паклаў праблему вагання Беларусі паміж Усходам і Захадам. Вызначыў, што беларуская ментальнасць - адмаўленне крайніх “месіянскіх” формаў усходняга «візантызму» і заходняга індывідуалізму і сінтэз лепшых бакоў гэтых двух культурна-гістарычных тыпаў на аснове самабытных форм грамадскага жыцця[4, с. 11-25 ].

Суліма разглядае праблемы выпадковасці, лёсу, Бога, Духа ў сувязі з гістарычна-філасофскімі ідэямі Новага часу. Разважанні пра беларускую культуру ён праводзіць у кантэксце роздумаў пра дзейнасць у імя дабра, бесперапынную творчую актыўнасць, увогуле пра удасканаленне свету . Такім чынам, на рубяжы XIX-XX стагоддзя ў беларускім культуразнаўстве назіраецца тэндэнцыя філасофскай распрацоўкі культуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Падбярэскі, Р. Беларусь і Ян Баршчэўскі / Рамуальд Падбярэскі // Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / [уклад., пер. з пол. мовы, камент. М. Хаўстовіча]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2014 . – С. 3-27.

2. Карский, Е.Ф. Белорусы [Текст] : в 3 т. Т. 2, кн. 2 : Язык белорусского народа / Е. Ф. Карский. - Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. - С.508.

3. Гарэцкі, М. І. Гісторыя беларускае літаратуры [Тэкст] / Максім Гарэцкі ; [уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб]. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1992. – С. 478.

4. Абдзіраловіч, І. (Канчэўскі). Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага [Тэкст] / Ігнат Абдзіраловіч ; [прадм. С. Дубаўца]. - Мінск : Навука і тэхніка, 1993. - С.42.